
Аўтар: На падставе інтэрнэт-крыніц
13.06.2021 00:00



 Аўстралія. Мітрапаліт Сіднэя выказаў пратэст супраць планаў новага ўрада аўстралійскага штата Новы Паўднёвы Уэльс узяць на сябе кіраванне ўсімі могілкамі, уключаючы касцёльныя. Ён адзначыў, што гэтую ролю прыняла б свецкая дзяржаўная бюракратыя, у той час як “клопат пра памерлых – гэта духоўная, а не свецкая місія”. “Наша вера вучыць, што гэта адзін з учынкаў міласэрнасці адносна цела, і ён ляжыць у аснове таго, як мы клапоцімся пра свае могілкі. Здаецца, урад разглядае валоданне могілкамі толькі як крыніцу даходу, без уразлівасці да іх духоўнага элемента і да пажаданняў сем’яў памерлых”, – адзначыў арцыбіскуп Энтані Фішэр. †

 Польшча. У Варшаве перад касцёлам капуцынаў устаноўлена ўнікальная скульптура канадскага мастака Цімаці Шмальца. “Бяздомны Езус” ужо з’явіўся, між іншым, у Ватыкане, Мадрыдзе і Дубліне. Скульптура прадстаўляе бяздомнага, які ляжыць на лаўцы, шчыльна захутаны ў плашч. З-пад плашча бачны толькі ногі са слядамі ран пасля ўкрыжавання. Праект па ўсталяванні ў Варшаве скульптуры з “Бяздомным Езусам” паўстаў каля 3-ох гадоў таму. Прапанова паступіла з Канады з асяроддзя Мальтыйскага ордэна.

 Францыя. У Парыжы Антыфа напала на працэсію вернікаў, якія збіраліся ўшанаваць памяць 49-ці католікаў, расстраляных антыклерыкальнымі прыхільнікамі Парыжскай камуны ў 1871 годзе. Удзельнікаў працэсіі, у тым ліку пажылых людзей, пабілі. Адзін чалавек шпіталізаваны. Адпраўной кропкай працэсіі была плошча de la Roquette, месца забойства тагачаснага арцыбіскупа Парыжа Жоржа Дарбоя. Працэсія, арганізаваная на заклік 5-ці парафій на ўсходзе Парыжа і некалькіх дыяцэзіяльных таварыстваў, павінна была прайсці 4 кіламетры вакол парафіі Нотр-Дам дэ Отаж, дзе 150 гадоў таму адбыліся расстрэлы.

 Англія. Па гістарычных саборах Англіі можна пілігрымаваць веласіпедам. Святыні злучыў маршрут агульнай даўжынёй больш за 3200 км. Як адзначаюць стваральнікі, шматкіламетровыя маршруты карыстаюцца ў Вялікабрытаніі ўсё большай папулярнасцю сярод веласіпедыстаў. Шлях, які злучае 42 – пераважна гатычныя – святыні павінен стаць для іх яшчэ адной альтэрнатывай, на гэты раз з выразным духоўным і гістарычным акцэнтам. Маршрут устанавіла Асацыяцыя англіканскіх сабораў у супрацоўніцтве з двума велаклубамі.